

«РАЗВОД?» — «МЕДЫЯЦЫЯ!»

Сямейная газета

«ЗАЛАТЫ ШЛЯГЕР» АДЗНАЧЫЎ ЮБІЛЕЙ 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

14 ЛІСТАПАДА 2019 г. ЧАЦВЕР № 216 (29083)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр РУМАК, намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

*«Каб чалавек з інваліднасцю, які можа працаваць, здолеў сябе рэалізаваць, у праекце закона «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі» прадугледжваюцца пэўныя механізмы. У іх ліку — квотаванне працоўных месцаў. Гэта значыць прадпрыемству, зыходзячы з колькасці работнікаў, будзе даводзіцца квота на працаўладкаванне інвалідаў. У многіх еўрапейскіх краінах распаўсюджана практыка ўключэння людзей з абмежаванымі магчымасцямі ў звычайныя працоўныя калектывы — як для іх сацыялізацыі і інтэграцыі ў грамадства, так і для змены стаўлення грамадства да такіх людзей».*

# ПРЫ ПОЎНЫМ ПАРАДЗЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## КОРАТКА

- **Замежныя інвестары ўклалі ў студзені — верасні 2019 года ў рэальны сектар эканомікі Беларусі (акрамя банкаў) $7,1 млрд.**
- Узровень зарэгістраванага беспрацоўя на 1 лістапада склаў 0,3 %.
- **Міністэрства аховы здароўя праводзіць анлайн-апытанне пра работу сістэмы электронных рэцэптаў.**
- Абноўлены радзільны дом Магілёўскай гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі прыняў першых парадзіх.
- **Беларуская біятланістка, алімпійская чэмпіёнка Надзея Скардзіна стала мамай.**



- У Беларусь прыбылі першыя два знішчальнікі Су-30СМ з чатырох, якія Узброеныя Сілы плануюць атрымаць сёлета.

Наша гісторыя

## У БЕЛАРУСІ БУДЗЕ СТВАРАЦЦА АРХЕАЛАГІЧНАЯ КАРТА

### Калі Скарына прыехаў у Кракаў, і як выглядаў малы Рагвалодавіч




**Толькі за апошнія дзесяць гадоў вучонымі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук адкрыты і даследаваны сотні археалагічных аб'ектаў па ўсёй краіне. І ў найбліжэйшы час перад даследчыкамі стаіць задача па стварэнні археалагічнай карты на падставе суцэльнага вывучэння ўсёй тэрыторыі краіны. На яе будуць нанесены ўсе вядомыя помнікі археалогіі і зоны аховы. Таксама наспела пытанне аб прысваенні археалагічным фондам статусу нацыянальнага здабытку.**

Археолагамі інстытута праведзены шырокамаштабныя выратавальныя даследаванні ў зонах будаўніцтва Гродзенскай і Віцебскай ГЭС, атамнай станцыі, Нежынскага калійнага камбіната, другой Мінскай кальцавой аўтадарогі, а таксама падчас добраўпарадкавання абласных і раённых цэнтраў краіны. Развіваюцца новыя кірункі — напрыклад, падводная і архітэктурная археалогія...

СТАР. 13

Людзі — суседзі

## ГОРАД, У ЯКІМ НЕ АДЗІНОКА

### Як ствараюцца суполкі, і прычым тут агуркі

**Першая сустрэча з суседзямі падчас атрымання ключоў ад новай кватэры звычайна праходзіць на ўздыме. Усе шчаслівыя, што дачакаліся запаветных «метраў», таму вельмі лёгка знаёмяцца паміж сабой. І я не выключэнне. Атрымаўшы ключы ад кватэры, адразу ж далучылася да вайбер-групы, якую стварылі актыўныя суседзі. Мэта групы была простая: прыбраць тэрыторыю і пад'езды разам, арганізавана. Але праз год гэты чат змог аб'яднаць вакол сябе суседзяў цэлага квартала.**

Памятаю, як пасля суботніка нехта з групы прапанаваў правесці маленькае свята для дзяцей: маўляў, многія малыя саромеюцца знаёміцца паміж сабой, а так, на свяце, побач з бацькамі ім будзе лягчэй. Скінуліся грашыма на аніматара, батут, прысмакі, і ў пэўны час усе, хто засяліўся, выйшлі на двор. Гэта было сапраўднае свята для малых! Яны хутка перазнаёміліся і знайшлі новых сяброў. Дзеці больш не сумавалі кожны ў сваёй кватэры. На наступны дзень яны ўжо хадзілі ў госці адзін да аднаго, разам гулялі ў двары.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

Саюзныя адносіны

# ПРАКЛАСЦІ ШЛЯХ НЯЛЁГКА

## «Мы падпішам дарожныя карты толькі ў тым выпадку, калі інтарэсы Беларусі будуць улічаныя»

**Аб гэтым заявіў журналістам прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей РУМАС. Адна з самых складаных для ўзгаднення дарожных карт — па Падатковым кодэксе, бо ўніфікаваць гэту сферу заканадаўства за кароткі час тэхнічна цяжка. Сяргей Румас звярнуў увагу, што не стаіць пытанне пра пераход на беларускі ці расійскі звод законаў. Неабходна ўзяць лепшыя практыкі ў кожнай краіне і ўніфікаваць падыходы.**

Падатковая нагрузка ў Расіі ніжэйшая, і для айчынных суб'ектаў гаспадарання паніжаныя стаўкі былі б выгадай. Але ўзнікае пытанне кампенсацыі для бюджэту выпадаючых прыбыткаў.

«Дыскусія з Расійскай Федэрацыяй ідзе якраз пра гэта — як Беларусь будзе кампенсаваць выпадаючыя прыбыткі, каб яны не аказалі негатыўнага ўплыву на эканоміку», — перадае БелТА словы кіраўніка ўрада. Пры гэтым ён лічыць, што па падатковай карце невырашальных пытанняў няма.

Няўзгодненыя яшчэ дарожныя карты па нафце, газе і энергетыцы. Па словах Сяргея Румаса, з 31 дарожнай карты амаль палова гатова да падпісання ў пакеце. Неўрэгуляваныя пытанні будуць вырашацца 19 лістапада пасля саюзнага Саўміна.

«Мы дамовіліся з расійскім прэм'ерам прайсціся па ўсіх картах і паспрабаваць максімальна зняць рознагалоссі, якія ёсць. Таму што прэзідэнтам мы не можам вынесці той блок рознагалоссяў, які ёсць сёння, — адзначыў Сяргей Румас. — Але гэта ўсё не невырашальныя пытанні. Яны паўставалі ў гісторыі нашых узаемаадносін з Расійскай Федэрацыяй і раней. Думаю, што мы знойдзем рашэнні».

Прэм'ер-міністр, адказваючы на пытанне, паведаміў: калі ўрады не здолеюць дамовіцца па нафце і газе, пытанне будуць вырашаць прэзідэнты.

Урады Беларусі і Расіі плануюць прадставіць кіраўнікам краін праекты дарожных картаў да 1 снежня.

# СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЗ МЕЖАЎ

## Міншчына прэзентавала свой патэнцыял у Кітаі

**Мінская вобласць шырока прадставіла свой гандлёва-прамысловы, інвестыцыйны і турыстычны патэнцыял на Другой Кітайскай міжнароднай выстаўцы імпартных тавараў і паслуг у Шанхаі, паведамілі ў прэс-службе Мінаблвыканкама.**


chinadaily.com.cn

Выстаўка будзе доўжыцца да 20 лістапада. Нацыянальная экспазіцыя Беларусі — адна з буйнейшых на форуме. На плошчы каля 790 квадратных метраў размясціліся сто айчынных прадпрыемстваў і арганізацый. Асобная зона прызначана для прэзентацый і дзелавых мерапрыемстваў. Свае магчымасці ў супрацоўніцтве з Кітаем прадстаўляе шэраг буйных кампаній Міншчыны, сярод якіх Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Агракамбінат «Дзяржынскі», «Слуцкі сыраробны камбінат», «Здравушка-мілк» і іншыя.

— Галоўнае для нас у супрацоўніцтве з Кітаем — трывала замацавацца на гэтым рынку. Сёння ў КНР акрэдытаваны ўсе малакаперапрацоўчыя прадпрыемствы Міншчыны. І гэта ўжо значны крок у развіцці нашых партнёрскіх стасункаў. Паміж двума рэгіёнамі — Мінскай вобласцю і горадам-пабрацімам Чунцынам — курсіруюць кантэйнерныя цягнікі, якія дастаўляюць на кітайскі рынак прадукты харчавання. Значна павялічыўся абарот тавараў і паслуг. Нядрэнныя паказчыкі і па экспарце сельгаспрадукцыі, — канстатаваў **першы намеснік старшыні Мінаблвыканкама Ігар МАКАР,** які ўзначальвае дэлегацыю цэнтральнага рэгіёна.

Першыя дні работы выстаўкі для сталічнай вобласці аказаліся прадуктыўнымі. У прыватнасці, рэзідэнтамі Кітайска-беларускага парка сталі дзве новыя кампаніі. Адна з іх — НТ ТАА «Спадарожнікавая сувязь Еўразіі» (КНР), якая створыць у парку навукова-даследчы цэнтр для распрацоўкі спадарожнікавых сістэм камунікацыі і кантролю. Другая — ТАА «ФЛЕКС-Н-РОЛЛ ПРО» (Беларусь, ЗША) — выходзіць з праектам у галіне прамысловай паліграфіі. Індустрыяльным паркам падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве з Інчуаньскай тэхніка-эканамічнай зонай (КНР). Вяліся таксама перагаворы наконт паставак ялавічыны прадпрыемствамі Мінскай вобласці ў Кітайскую Народную Рэспубліку.

Акрамя таго, Мінская вобласць падпісала дарожную карту супрацоўніцтва з правінцыяй Гуандун Кітайскай Народнай Рэспублікі на 2020—2021 гады. Падпісы пад дакументам паставілі першы намеснік старшыні аблвыканкама Ігар Макар і віцэ-губернатар правінцыі Гуандун Чэнь Лянсан.

Ігар Макар адзначыў, што галоўная мэта супрацоўніцтва — прамая канаперацыя. Прадпрыемствы Мінскай вобласці ўжо наладзілі кантакты з кітайскімі партнёрамі. За студзень — жнівень 2019 года ў Кітай адгружана мяса-малочнай прадукцыі на суму 17,5 мільёна долараў ЗША. Усе малакаперапрацоўчыя заводы маюць дазвол на пастаўку прадукцыі ў КНР, а таварыства з абмежаванай адказнасцю «ВелесМіт» — сертыфікат на экспарт ялавічыны. Адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Агракамбінат «Дзяржынскі» і «Смалявічы Бройлер» акрэдытаваны на пастаўку ў Кітай мяса птушкі.

Плённымі сталі і сустрэчы ў Гуандунскім саюзе па супрацоўніцтве з краінамі СНД і Дэпартаменце камерцыі Гуандуна, дзе прадстаўнікі Міншчыны расказалі пра эканамічныя магчымасці цэнтральнага рэгіёна.

— Знешнегандлёвы абарот Мінскай вобласці з Кітаем за студзень — жнівень 2019 года склаў больш за адзін мільярд долараў ЗША, у тым ліку экспарт — 335 мільёнаў долараў ЗША. Гэта ў два разы больш у параўнанні з адпаведным леташнім перыядам. Мы зацікаўлены развіваць супрацоўніцтва ў частцы інвеставання ў сельскагаспадарчую галіну Мінскай вобласці, — адзначыла **старшыня камітэта эканомікі Мінаблвыканкама Тацццяна БРАНЦЭВІЧ.**

Абмеркаваны таксама пытанні пастаўкі сельскагаспадарчай прадукцыі ў Кітай і стварэння сумеснага малакаперапрацоўчага прадпрыемства. Падчас наведвання карпарацыі Greenland Group AAT «Слуцкі сыраробны камбінат» заключыла дагавор пастаўкі прадукцыі на два мільёны долараў ЗША. Яшчэ адзін дакумент падпісаны з кампаніяй Shanhai Pujia Food Technology Co.

**Тацццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Насустрач Токіа-2020

# АЛІМПІЯДА БЛІЖЭЙ, ПЛАНЫ БОЛЬШ КАНКРЭТНЫЯ

**Адбылося пасяджэнне аргкамітэта па забеспячэнні падрыхтоўкі і ўдзелу беларускіх спартсменаў у XXXII летніх Алімпійскіх гульнях і XVI летніх Параалімпійскіх гульнях.**

Падчас пасяджэння былі разгледжаны пытанні падрыхтоўкі спартсменаў — кандыдатаў на ўдзел у Гульнях у Токіа, агучаны праблемныя моманты, абмеркавана аснашчанасць камандаў неабходным інвентаром, экіпіроўкай, медыцынскім абсталяваннем, а таксама сродкамі аднаўлення, разгледжаны пытанні антыдопінгавага кантролю.


Фота БелТА.

Сяргей КАВАЛЬЧУК і Ігар ПЕТРЫШЭНКА.

**Намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА** звярнуў увагу, што да пачатку спаборніцтваў засталося крыху больш за восем месяцаў. З боку дзяржавы, паводле яго слоў, прынятыя ўсе неабходныя меры для забеспячэння належнай падрыхтоўкі да маючых адбыцца спаборніцтваў. Цяпер завяршаецца трэці этап падрыхтоўкі, галоўнай задачай беларускіх спартсменаў на ім з'яўляецца заваяванне алімпійскіх ліцэнзій і мадэляванне спаборніцкай дзейнасці ва ўмовах, набліжаных да спаборніцтваў.

Па стане на 6 лістапада алімпійскія кваліфікацыйныя патрабаванні і нарматывы выканалі 63 беларускія спартсмены ў 51 дысцыпліне па 13 відах спорту. У іх ліку барацьба, веласпорт, гімнастыка, веславанне, лёгкая атлетыка, плаванне, парусны спорт. Адбор па некаторых відах спорту працягнецца да канца чэрвеня 2020 года.

«Лічым, што да завяршэння алімпійскага адборачнага перыяду рэальна можна разлічваць на заваяванне каля 100 алімпійскіх ліцэнзій, — прыводзіць словы **міністра спорту і турызму краіны Сяргея КАВАЛЬЧУКА БелТА.** — *Аналіз выступленняў каманд па летніх відах спорту ў апошніх двух алімпійскіх цыклах сведчыць аб тым, што традыцыйна выніковымі для Беларусі з'яўляюцца веславанне на байдарках і каноэ, цяжкая атлетыка, мастацкая гімнастыка, скачкі на батуце, барацьба».*

На сённяшні дзень магчымасць адабрацца ў Токіа, па словах міністра, захоўваюць мужчынская гандбольная зборная, жаночая баскетбольная зборная (3х3) і жаночая каманда па пляжным валейболе. Разам з тым не даводзіцца разлічваць на высокія медальныя перспектывы беларускіх спартсменаў у бадмінтоне, сінхронным плаванні, конным спорце, тэквандо.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# Сэлфі-конкурс сярод маладых выбаршчыкаў

**12 лістапада ў сацыяльнай сетцы «УКантакце», а таксама сэрвісе Instagram @minskbrsm стартаваў сэлфі-конкурс БРСМ «#МолодежьГолосует».**



Фота БелТА.

Мінская гарадская арганізацыя БРСМ прапануе маладым людзям зрабіць сэлфі на выбарчым участку ў дні датэрміновага галасавання і 17 лістапада, апублікаваць яго на сваёй старонцы «УКантакце» або акаўнце ў Instagram з хэштэгамі #выборы2019, #молодежьголосует, #яголосую і адзначыць афіцыйны акаўнт БРСМ Мінска @minskbrsm.

Адразу ж пасля публікацыі сэлфі карыстальнік аўтаматычна робіцца ўдзельнікам конкурсу, які завершыцца 17 лістапада ў 23.59. Вынікі конкурсу будуць падведзены 19 лістапада і апублікаваны ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» ў групе «МІНСК — БРСМ | МІНСК — СТАЛІЦА МОЛАДЗІ!» Уладальнікі дзесяці самых крэатыўных сэлфі будуць узнагароджаны памятнымі сувенірамі. Абсалютны пераможца конкурсу атрымае ў падарунак фітнес-бранзалет.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Да ведама

# А ВЫ ЗАПЛАЦІЛІ МАЁМАСНЫ ПАДАТАК?

## Да сярэдзіны лістапада яшчэ можна паспець

**Засталося зусім няшмат — пару дзён. Міністэрства па падатках і зборах нагадвае, што аплату падатку на нерухомасць і зямельнага падатку фізічным асобам неабходна зрабіць не пазней за 15 лістапада.**

У прыватнасці, гэта наўпрост датычыцца гаспадароў індывідуальных домаўладанняў, уласнікаў двух і больш жылых памяшканняў у шматкватэрных і блакіраваных дамах, надворных пабудоў, гаражоў, іншых будынкаў і машына-месцаў, зямельных участкаў, прынятых у спадчыну, дадзеных ва ўласнасць, пажыццёвае спадчыннае валоданне альбо карыстанне, а таксама ў арэнду.

Варта адзначыць, што сумы падаткаў, добраахвотна не выплачаныя ў бюджэт, спаганяюцца ў прымусовым парадку з налічэннем пені за кожны каляндарны дзень пратэрміноўкі. Вам трэба плаціць лішнія грошы?

**Сяргей КУРКАЧ.**

Бяспека

# Рэагаванне ажыццяўляецца планава

**За апошнія тры гады ў беларускай арміі ў два разы павялічана колькасць раптоўных праверак з выхадам войскаў да дзяржаўнай граніцы. Пра гэта на семінары для кіраўнікоў рэспубліканскіх СМІ паведаміў міністр абароны Андрэй Раўкоў. «За апошнія тры гады мы больш чым на 20 працэнтаў нарасцілі інтэнсіўнасць мерапрыемстваў аператыўнай і баявой падрыхтоўкі», — адзначыў кіраўнік Мінабароны.**

Міністр паведаміў, што мае месца значная актывізацыя ваеннай дзейнасці ў Еўропе, у тым ліку ў суседніх з Беларуссю краінах, перадае БелТА. Падчас праводзімых Захадам аперацый «Атлантычная рашучасць» і «Узмоцненая перадавая прысутнасць» вайсковы кантынгент НАТА і ЗША, размешчаны на ратацыйнай аснове на тэрыторыі суседніх з Беларуссю дзяржаў, за апошнія шэсць гадоў павялічаны ў 13 разоў — з 550 чалавек да больш чым сямі тысяч, колькасць адзінак узбраення і тэхнікі вырасла ў пяць разоў. З 25 тысяч да 40 тысяч чалавек павялічана колькасць сіл першачарговага задзейнічання НАТА. Актыўна рэалізуюцца планы па ўзмацненні амерыканскай групоўкі войскаў ва Усходняй Еўропе.

З сярэдзіны кастрычніка бягучага года на літоўскай тэрыторыі за 15 кіламетраў ад беларускай граніцы размешчаны танкавы батальён сухапутных войскаў ЗША (500 ваеннаслужачых, 29 танкаў «Абрамс», 25 БМП «Брэдлі») падчас аперацыі «Атлантычная рашучасць». Гэта значыць, што ўпершыню каля граніцы Беларусі размешчана амерыканская бронетэхніка. «Зразумела, што гаворка не ідзе пра агрэсію, гэта не прамая ваенная пагроза. Але відавочным фактам з'яўляецца рост ваеннай небяспекі для краіны», — адзначыў міністр.

Акрамя таго, Злучаныя Штаты працягваюць распрацоўваць варыянты стварэння і выкарыстання буйных міжвідавых групоўак войскаў ва Усходне-Еўрапейскім рэгіёне. Адпаведныя пытанні плануецца адпрацаваць на маючым адбыцца шматнацыянальным вучэнні «Абаронца Еўропы — 2020», якое пройдзе на тэрыторыі дзесяці дзяржаў, у тым ліку Польшчы і краін Балтыі. Заяўленая колькасць прыцягнутага асабістага складу — каля 37 тысяч чалавек, 20 тысяч з якіх — ваеннаслужачыя ЗША.


Фота БелТА.

Асноўнай мэтай мерапрыемства з'яўляецца практычная адпрацоўка пытанняў перакідання амерыканскага агульнавайсковага злучэння ў Еўропу, а таксама праверка гатоўнасці і магчымасцяў адпаведнай інфраструктуры еўрапейскіх дзяржаў прыняць і размясціць вайскі ўзмацнення. Пры гэтым узбраенне і ваенная тэхніка будуць дастаўлены ў раёны правядзення вучэння як з тэрыторыі ЗША, так і з месцаў папярэдняга захоўвання на тэрыторыі еўрапейскіх краін. Вучэнне фактычна з'яўляецца прамежкавым этапам у комплекснай ацэнцы мерапрыемстваў па павышэнні так званай ваеннай мабільнасці, якія рэалізуюцца з 2016 года.

За апошнія пяць гадоў колькасць вучэнняў альянсу каля беларускіх граніц і задзейнічанага ў іх асабістага складу ўзрасла больш чым удвая. Паралельна з прыёмам кантынгентаў у суседніх дзяржавах удасканальваецца ваенная інфраструктура, прычым прыярытэт аддаецца мадэрнізацыі палігонаў і аэрадромаў, прымаюцца дакументы, якія спрашчаюць парадак разгортвання і перамяшчэння войскаў НАТА ў межах Еўрасаюза. «Таксама істотна павялічаны выдаткі на абарону. За апошнія пяць гадоў ваенныя асігнаванні Польшчы выраслі на 30 працэнтаў, Літвы — амаль у 2,5 раза, Латвіі — у тры разы», — канстатаваў Андрэй Раўкоў.

Ва ўмовах абвастрэння супрацьстаяння па лініі Усход — Захад Беларусь рэалізуе палітыку, заснаваную на канкрэтных прыярытэтах. «Адначасова мы вымушаны рэагаваць на актывізацыю ваеннай дзейнасці ў Еўропе, у тым ліку непасрэдна каля нашых граніц. Прычым гаворка не ідзе абавязкова пра сіметрычныя адказы, — падкрэсліў міністр. — Мы былі гатовыя да падобнага развіцця ваенна-палітычнага становішча. Таму рэагаванне ажыццяўляецца планава».

Пацверджанне таму, па словах кіраўніка Мінабароны, — будаўніцтва і развіццё Узброеных Сіл як пастаянны працэс, аснашчэнне перспектыўнымі і мадэрнізаванымі ўзорамі ўзбраення і тэхнікі, падрыхтоўка войскаў да высокаманеўраных мабільных дзеянняў, прыярытэтнае развіццё ВПС і войскаў СПА, ракетных войскаў, сіл спецыяльных аперацый і іншых кірункаў, што рэалізуюцца краінай на працягу двух дзесяцігоддзяў. Яшчэ ў 2007-м было прынята рашэнне аб стварэнні падраздзяленняў рэагавання з высокай ступенню гатоўнасці. Створаныя сілы неадкладнага рэагавання і сілы хуткага разгортвання. Гэты кампанент ёсць як у сухапутных войсках, так і ў ВПС і войсках СПА.

Акрамя таго, дадаткова будуць прыняты меры па ўзмацненні дзяржаўнай граніцы і павялічана колькасць сухапутнага кантынгенту войскаў на літоўскім напрамку. У 2020 годзе будуць унесены карэктывы ў планы прымянення РГВ(С) Беларусі і Расіі. Актуальным з'яўляецца прынццце Канцэпцыі інфармацыйнай бяспекі Беларусі. Ваеннае ведамства брала ўдзел у яе падрыхтоўцы і ўнесла шэраг фундаментальных прапаноў, накіраваных на забеспячэнне абароны інфармацыйных і інфармацыйна-тэхнічных сістэм.

Падрабязнасці

# ВЫРАШАЛІ ДОЛІ СЕКУНДЫ

## Вясковы жыхар бясстрашна ўвайшоў у палаючы дом і вынес адтуль дзіця

**Пажар у адной з кватэр трохпавярховага дома па вуліцы Савецкай вёскі Вулька Аброўская Івацэвіцкага раёна здарыўся раніцай. У гэты час гаспадары дома паехалі на работу, а чатырохгадовага сына пакінулі ў пакоі, калі хлопчык яшчэ спаў.**

Як пазней патлумачыла маці хлопчыка Вольга Кулініч, яна спадзявалася, што хутка ад бабулі прыйдзе яе 10-гадовая дачка і прыглядзіць за малым. Але дзяўчынка затрымалася, а маленькі Ягор знайшоў запалкі, стаў гуляць з імі, пакуль не ўчыніў пажар. Калі з вокнаў і дзвярэй паваліў дым, суседзі найперш патэлефанавалі на нумар «101», а найбліжэйшы сусед Дзмітрый Крыцкі адразу кінуўся да дзвярэй, пастукаў, стаў пытацца, ці ёсць хто ў хаце. У адказ пачуў слабы дзіцячы голас — малое клікала маму. На пошукі лома ці сякеры часу не было, мужчына рашуча выбіў дзверы нагамі, але паток гарачага паветра і дыму літаральна валіў з ног. Тады адважны сусед прыкрыў нос уласным адзеннем і, сагнуўшыся, пайшоў у кватэру, ахопленую пажарам. На падлозе аднаго з пакояў ён знайшоў хлопчыка, вынес яго ў калідор, а затым на вуліцу. Там ужо былі медыкі з мясцовага ФАПа, агледзелі дзіця. Шпіталізацыя яму не спатрэбілася.

Як паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей МАШНОЎ**, ратавальнікі прыбылі літаральна праз тры хвіліны пасля выкліку. Давялося эвакуіраваць на некаторы час жыльцоў гэтага дома. Пажар хутка патушылі, але агонь знішчыў абстаноўку аднаго з пакояў кватэры. «Мы вельмі ўдзячныя відавочцу пажару, грамадзяніну Крыцкаму, які праявіў смеласць і рашучасць», — дадаў Сяргей Машноў.

Сам жа Дзмітрый Крыцкі сябе героем не лічыць.

— На маім месцы гэтак зрабіў бы любы мужчына, — сказаў 34-гадовы вясковец. — У мяне таксама дзіця расце. А тады ўсё вырашалі долі секунды, марудзіць было нельга. Я рады, што ў Ягоркі ўсё добра, ён адчувае сябе нармальна.

У размове з карэспандэнтам газеты **старшыня Жытлінскага сельскага Савета Пётр СВІБОВІЧ сказаў:**

— Няшчасце здарылася ў звычайнай сельскай сям'і. Муж з жонкай працуюць у сельгаспрадпрыемстве, гадуюць дваіх дзяцей. Бацькі малога Ягора добра ўсвядомілі, што малое нельга пакідаць без нагляду нават на некалькі хвілін. Гэты выпадак мы будзем згадваць падчас прафілактычнай работы з сем'ямі, якія выхоўваюць дзяцей. Агонь, як бачым, не даруе бацькоўскіх агрэхаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Здарэнне

# АЎТО ПАДПАЛІЎ БЫЛЫ МУЖ?

**Удзень у Савецкі РАУС Гомеля паступіла паведамленне ад відавочцы аб тым, што невядомы разбіў шкло ў легкавым аўтамабілі, які стаіць каля шматпавярховага дома па Рэчыцкім праспекце, а затым падпаліў яго.**

На месца здарэння прыбылі супрацоўнікі міліцыі і МНС, якія разам з відавочцамі ліквідавалі пажар. Высветлілася, што згарэлая іншамарка належыць гамяльчанцы 1978 года нараджэння. Яна расказала, што да падпалу машыны можа быць датычны яе былы муж.

У ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў сышчыкі знайшлі мужчыну. Непрацуючы гамяльчанін 1976 года нараджэння быў дастаўлены ў міліцыю. Як паведамляе УУС Гомельскага аблвыканкама, мяркуючы па яго вопратцы, грамадзянін сам ледзь не пацярпеў ад пажару.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Узброеныя сілы Балівіі прызналі сенатара Аньес выканаўцам абавязкаў прэзідэнта



Прадстаўнікі вышэйшага камандавання Узброеных сіл (УС) Балівіі прызналі другога віцэ-спікера палаты сенатараў (верхняй палаты парламента) Жанін Аньес часовым кіраўніком дзяржавы і выказалі ёй сваю падтрымку.

Пра гэта гаворыцца ў заяве камандуючага балівійскімі УС Ульямса Калімана, апублікаванай у газеце Pagina Siete. Раней Аньес абвясціла, што бярэ на сябе выканане абавязкаў прэзідэнта, і абяцала як мага хутчэй правесці новыя выбары кіраўніка дзяржавы. Да гэтага палата сенатараў шматнацыянальнай заканадаўчай асамблеі (парламента) Балівіі не змагла сабраць кворум для правядзення пазачарговага пасяджэння, склікананага для абмеркавання палітычнага крызісу. Былы прэзідэнт Эва Маралес, які перабраўся ў Мексіку, дзе яму далі палітычны прытулак, асудзіў рашэнне Аньес, адзначыўшы, што яно было прынята «ў асяроддзі саўдзельнікаў і пры падтрымцы ўзброеных сіл і паліцыі, якія душаць народ».

## WP: Трамп прапанаваў Эрдагану здзелку на 100 мільярдаў долараў



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп прапанаваў турэцкаму лідару Рэджэпу Таіпу Эрдагану гандлёвую здзелку на $100 млрд з выгаднымі для рэспублікі ўмовамі, а таксама дапамогу ў вырашэнні сітуацыі вакол санкцый, якія Вашынгтон павінен увесці супраць Анкары ў сувязі з купляй расійскіх зенітных ракетных сістэм (ЗРС) С-400. Пра гэта паведаміла газета The Washington Post. Па звестках яе крыніц у вашынгтонскай адміністрацыі, Трамп на мінулым тыдні адправіў Эрдагану ліст, пералічыўшы гэтыя прапановы, якія павінны паслужыць паляпшэнню амерыкана-турэцкіх адносін.

Як паведаміла крыніца выдання, цяпер вашынгтонская адміністрацыя настойвае на тым, што С-400 «не ўводзяцца ў эксплуатацыю», каб яны не маглі «мець доступ да сродкаў камунікацыі і абароны амерыканскага F-35». У такім выпадку Анкара можа вярнуцца да праграмы стварэння шматмэтавых знішчальнікаў F-35 і пазбегнуць абмежаванняў.

## У Венецыі рэкордная паводка, ёсць ахвяры

Два чалавекі сталі ахвярамі непагадзі, якая абрынулася на Венецыю і суседнія з ёй астравы, паведамілі мясцовыя СМІ. Раней гарадскія ўлады паведамлялі, што ўзровень вады дасягнуў 187 сантыметраў. Пасля рэкордных 194 сантыметраў у 1966 годзе гэта другі ўзровень у гісторыі. Паводка вышэй за 140 сантыметраў залівае 90 працэнтаў горада.

Цяперашняя aqua alta («высокая вада») прывяла да сур'ёзнай шкоды для горада: у сацсетках распаўсюджваюцца здымкі выкінутых на набярэжныя рачных трамваяў вапарэта і лодак. Затопленым ўвесь гістарычны цэнтр: вада запоўніла нават крыпту базылікі Сан-Марка. Закрытыя школы, гараджан просяць не пакідаць дамы. Назіраюцца перабоі з тэлефоннай сувяззю. Мэр Венецыі Луіджы Бруньяра ў прыліве і залевах абвінаваціў глабальнае пацяпленне. Мэрыя папрасіла жыхароў і мясцовыя прадпрыемствы задакументаваць прычыненую непагаддзю шкоду.

Феномен «высокай вады» характэрны для Венецыі, размешчанай на некалькіх астравах у лагуне Адрыятычнага мора. Ён звязаны з павышэннем узроўню мора, што здараецца, як правіла, восенню і вясной і залежыць ад месячных цыклаў і прыліваў. Пэўныя кліматычныя з'явы, такія як моцныя дажджы, могуць прыводзіць да абвастрэння становішча. У дадзеным выпадку гэтаму спрыяла даждлівае надвор'е і пэўны вецер з мора. Адначасова ўлады паўднёвых раёнаў Італіі аб'явілі аб павышэнні небяспекі паводак у сувязі з непагаддзю. У Неапалі было вырашана закрыць школы, а таксама гарадскія паркі пасля прагнозаў аб моцным штармавым ветры.

# ГОРАД, У ЯКІМ НЕ АДЗІНОКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Гэтае свята вельмі аб'яднала суседзяў, — гаворыць **адна з актывістак дома, Алена ФРАЛОВА.** — Мы спадзяваліся, што яно стане традыцыяй. Сапраўды так і выйшла. Людзі ўжо ведалі, хто стаіць за пэўнай аватаркай у вайбер-групе.

Больш за тое, людзі сталі бліжэй знаёміцца і сябраваць. Усе ведалі, што ў Веры з другога пад'езда добра атрымалася падрыхтаваць свята і, калі трэба, яна параіць, куды звяртацца, каб арганізаваць незабыўны дзень нараджэння малых. Валя з чацвёртага шые неверагодная прыгажосці лялькі, а Віктар-будаўнік можа даць парады па рамонце. Знайшліся прадпрымальнікі, цырульнікі, электрыкі... Можна працягваць бясконца — у доме каля 200 кватэр. З кожным днём усё больш жыхароў далучалася да групы ў вайберы. Там можна было ўбачыць паведамленні накшталт: «каму патрэбны кнігі, прыходзьце ў другі пад'езд, ляжаць у скрыні», «прывезла з дачы зашмат алычы — разбірайце», «перабіраю дзіцячыя рэчы — каму патрэбна задарма адзенне на пяцігадовую дзяўчынку?» і іншыя.

— Аднойчы я пачула ад суседкі, што яна не мае часу нават схадзіць на рынак агуркоў купіць, — успамінае Алена.— Я ёй вельмі спачувала, бо ў самой пяцёра дзяцей і я ведаю, як гэта цяжка — цягнуцца з малымі ў краму. Вось тады ў мяне і мільганула думка дапамагчы і сабе, і ёй.

Сама Алена з'яўляецца ўдзельніцай многіх груп у інтэрнэце. Жанчына ўспомніла, што бачыла аб'яву аб продажы агуркоў. Стала шукаць і знайшла таго фермера. Але агуркоў у яго было зашмат, таму жанчына прапанавала набыць іх усім суседзям.

— Чакалі з нецярпеннем гэтую гародніну, я чула шмат падзяк за арганізацыю і знаходлівасць, але... Фермер не прыехаў і не адказваў на тэлефонныя званкі. Я разгубілася, было сорамна перад суседзямі за свае абяцанні. Але мяне ніхто не асудзіў, наадварот падтрымалі, і тады я вырашыла, што абавязкова знайду ім агуркі. І знайшла, праўда не такія танныя, але прывезлі іх літаральна да пад'езда. Выкупілі ў чалавека ўсе, нават не хапіла. А я так натхнілася, што вырашыла пашукаць яшчэ і клубніцы, — расказвае Алена.



Дзеці з бацькамі падчас свята двара.

Суседзі раскупілі ягады за паўгадзіны і ў вайберы дзяліліся ўражаннямі. Неўзабаве і жыхары суседніх дамоў сталі заўважаць, што ў адзін з двароў часта прыязджаюць машыны з ягадамі, і сталі прасіцца ў групу дома. Тады Алена зразумела, што трэба стварыць асобную групу па закупках. Так і зрабіла. Часта жанчыне не прыходзілася нікога шукаць: фермеры пісалі самі. Яны ехалі ў пэўны дзень у Мінск і па дарозе заязджалі ў двор. Здаралася, што пасля продажы каля дома прадаўцам было нечага везці на рынак. У хуткім часе пачалі прывозіць не толькі гародніну і ягады, але і мяса, сыры, мёд, яйкі, арэхі...

— Гэтыя прадукты не заўсёды таннейшыя, чым у краме ці на рынку, затое нікуды ісці не трэба. У групе прапануюць агародніну і самі суседзі. Напрыклад, ужо некалькі разоў прыязджаў дзядуля аднаго з жыхароў дома. У яго вялікі яблыневы сад, дык ён нам яблыкі прывозіць па рублі — гэта ў два разы танней, чым прапануюць фермеры. Таму наш дзядуля карыстаецца папулярнасцю. Яшчэ набываем найсмачнейшае дамашняе сала па 10 рублёў, а смакаты на ўсе 100! Сыр тварожны, запечаны таксама таннейшы, чым у краме, і ўсё дамашняе са свежага малака. Бульбу і цыбулю суседзі самі з лецішчаў прывозяць і прапануюць па 60 капеек. Бывае, што за кабачкі і буракі ў сезон увогуле ніхто грошы не бярэ — аддаюць задарма, — кажа Алена.



Такую смакату могуць набыць удзельнікі групы.

Калі жанчына стала паглыбляцца ў гэтую тэму, то была ўражана некаторымі з'явамі. Ну, напрыклад, знойдзе яна людзей, якія паабяцаюць прывезці агародніну са свайго падворка, а потым праз пару гадзін тыя паведамляюць, што не прыедуць: маўляў, ужо ўсё прадалі. Алена дзівілася: калі толькі паспяваюць? А аднойчы ёй растлумачылі, чаму так адбываецца. Дапамагла разабрацца ў сітуацыі зборшчыца чарніц. Дамовіліся, што яна назбірае некалькі скрынак ягад і прывязе ў Мінск па кошце чатыры рублі за кіло. А праз некаторы час жанчыне нехта патэлефанаваў і прапанаваў перакупіць ягады. Але тая адмовілася ад прапановы, бо палічыла гэта непрыстойным у адносінах да Алены і іх агульных дамоўленасцяў. Было, што да стваральніцы незвычайнай вайбер-групы звярталіся вялікія пастаўшчыкі. Напрыклад, прапаноўвалі... фуру вычышчаных грэцкіх арэхаў па долары за кіло — з умовай выкупіць усё і адразу. Але, канешне, Алена адмаўляла, бо грошай на фуру арэхаў, нават такіх танных, у яе няма, ды і хто прадаваць будзе?

«Нядаўна нейкі рыбгас патэлефанаваў. Але не стаў з намі звязвацца, бо яны падлічылі, што ім не выгадна адпраўляць машыну ў наш двор», — тлумачыць жанчына.

Алена рада, што ў яе атрымалася арганізаваць для сябе і суседзяў такую карысную справу. Канешне, гэта не пазбавіла людзей цалкам ад неабходнасці хадзіць па крамах і рынках, але аб'яднала жыхароў некалькіх дамоў. Людзі больш ахвотна сталі дапамагаць адзін аднаму. Напрыклад, паднялася ў дзіцяці тэмпература, а патрэбных лекаў няма. Кінеш паведамленне ў агульны чат — маўляў, можа хто ў аптэку ідзе? І тут жа знаходзяцца людзі, якія могуць дапамагчы па-суседску. Людзі вiншуюць адзін аднаго са святамі і нават сустракаюць з шарыкамі і кветкамі новых маленькіх жыхароў з радзільнага дома. Канешне, актыўнасць суседзяў у вайбер-групе — велічыня непастаянная, бывае час, калі той ці іншы маўчыць. Але ўсё роўна ёсць упэўненасць: калі што, то суседзі дапамогуць.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# У 700 пенсіянераў пачынаецца новы навучальны год

**Мінскі ўніверсітэт трэцяга ўзросту адкрывае новы сезон. Сёлета на курсы гэтай нефармальнай навучальнай установы залічана 700 слухачоў, якія будуць навучацца па 26 кірунках. Сярод іх з'явіліся такія новыя, як каліграфія, пакаёвае садоўніцтва, узроставы макіяж, экскурсазнаўства, школа прававой адукаванасці.**

Самай вялікай папулярнасцю ва ўніверсітэце трэцяга ўзросту традыцыйна карыстаецца англійская мова — на гэты кірунак сёлета залічаны 176 чалавек, і гэта яшчэ далёка не ўсе ахвотныя.

Таксама абсалютна любы мінчанін, старэйшы за 60 гадоў, можа наведваць заняткі ў «Школе экалогіі» і «Школе прававой адукаванасці». Сустрэчы са спецыялістамі праходзяць раз у месяц на базе сталічнай бібліятэкі імя Янкі Купалы. Нагадаем, што ўсе заняткі ва ўніверсітэце трэцяга ўзросту бясплатныя.



Акрамя навучальных курсаў праект «Мінскі ўніверсітэт трэцяга ўзросту» прапануе сваім слухачам удзел у Цэнтры грамадскай актыўнасці. Спіс валанцёрскіх праектаў немаленькі: «Буккросінг», «Бабуля на гадзіну», «Рэпетытар», «Офісны садоўнік», «Кола дабра», «Падорым дзецям радасць»... Акрамя таго, ва ўніверсітэце вітаецца ініцыятыва: любы слухач можа прапанаваць уласны валанцёрскі праект.

**Праект «Мінскі ўніверсітэт трэцяга ўзросту» рэалізуе грамадская арганізацыя «Беларуская асацыяцыя сацыяльных работнікаў» пры падтрымцы генеральнага партнёра — кампаніі JTI.**

Добрая навіна: сёлета філіял «Мінскага ўніверсітэта трэцяга ўзросту» адкрыўся ў Магілёве. Заняткі будуць праходзіць на базе Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Ленінскага раёна гэтага абласнога горада. Гараджане, старэйшыя за 60 гадоў, ужо цяпер могуць запісацца на англійскую мову, пілатэс або наведваць літаратурную гасцёўню.

**Святлана БУСЬКО.**


**Извещение о проведении 25 ноября 2019 года повторных торгов с условиями по продаже единым предметом торгов имущества, принадлежащего ОАО «ОПЫТНО-ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД ТЕХНОЛОГИЧЕСКОГО ОБОРУДОВАНИЯ»**

| Предмет торгов |
|---|
| Капитальное строение с инв. № 500/С-16562 (наименование – корпус № 1 (лит. А 2-3/к), назначение – здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения)), общей площадью 5 189 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-6590 (наименование – корпус № 2 (лит 2/к)), назначение – здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения), общей площадью 1 778 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-699 (наименование – корпус № 3 (лит. В 2/к)), назначение – здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения), общей площадью 956 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-8845 (наименование – корпус № 4 (лит Б 1-2/к)), назначение – здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения), общей площадью 724 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-26037 (наименование – склад (лит. 3 1/к)), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, общей площадью 26 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-25294 (наименование – компрессорная), назначение – здание нежилое, общей площадью 60 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-26036 (наименование – здание КПП), назначение – здание нежилое, общей площадью 5 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-22908 (наименование – склад (лит. Ж 1/к)), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, общей площадью 143 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-6419 (наименование – здание заводоуправления (лит. Д 1/д), назначение – здание нежилое, общей площадью 78 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-16563 (наименование – трансформаторная (лит. Е 1/к)), назначение – здание специализированное энергетики, общей площадью 40 кв. м; изолированное помещение с инв. № 500/D-798797245 (наименование – производственное помещение), общей площадью 1922,6 кв. м; элементы благоустройства к капитальному строению с инв. № 500/С-24516 (литер а – проезд, литер б – дворовое покрытие, литер в – площадка, литер г – проезд, литер д – открытая крановая эстакада, литер е – площадка, литер ж – площадка, литер и – площадка, литер к – площадка под навес, литер л – площадка, литер м – площадка под навес, литер н – площадка под навес, литер п – площадка под навес, литер р – площадка, литер с – площадка, литер т – площадка, литер у – площадка, литер ф – площадка, литер х – площадка, литер ц – дорожка, литер ч – площадка, литер ш – площадка, литер э – площадка под навес, литер ю – площадка, литер я – площадка под навес, литер аа – дорожка, литер аб – дорожка, литер ав – дорожка, литер аг – площадка, литер ад – подпорная стена, литер ае – подпорная стена, литер аж – подпорная стена, литер аи – ограждение, литер ак – ограждение, литер ал – ограждение, литер ам – ограждение, литер ан – ворота, литер ап – ворота, литер ар – ворота, литер ас – ворота, литер ат – ворота, литер ау – ворота, литер аф – ворота, литер ах – калитка, литер ац – шлагбаум, литер ач – бордюр, литер ач – бордюр); капитальное строение с инв. № 500/С-1026690 (наименование – пожарный резервуар) общей площадью 28,3 кв. м; капитальное строение с инв. № 500/С-1026898 (наименование – кабельная линия 6 кВ) протяженностью 161,4 м; капитальное строение с инв. № 500/С-1026897 (наименование – газопровод) протяженностью 211,6 м; капитальное строение с инв. № 500/С-1026809 (наименование – хозяйственно-питьевая водопроводная сеть) протяженностью 171,7 м; капитальное строение с инв. № 500/С-1026808 (наименование – хозяйственно-бытовая канализационная сеть) протяженностью 489,4 м |
| **Местонахождение:** г. Минск, пр-т Машерова, д. 15 |
| **Сведения о земельном участке:** кадастровый номер 500000000007000686, площадь – 1,8918 га |
| **Начальная цена:** 7 239 917,40 бел. руб. без учета НДС |
| **Сумма задатка:** 723 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ОПЫТНО-ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД ТЕХНОЛОГИЧЕСКОГО ОБОРУДОВАНИЯ», пр-т Машерова, 15, 220029, г. Минск, тел. (017) 292-73-88.
**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 327-05-62.
**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 0,5 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.
Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «ОПЫТНО-ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД ТЕХНОЛОГИЧЕСКОГО ОБОРУДОВАНИЯ», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.
Торги проводятся **25 ноября 2019 года** в **16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.11.2019 по 21.11.2019** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.
**Телефоны для справок: (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (029) 693-45-06 (ОАО «ОПЫТНО-ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД ТЕХНОЛОГИЧЕСКОГО ОБОРУДОВАНИЯ»).**

Сямейная газета

Выпуск № 16 (134)

# ПЛАН НА ПАСЛЯ-ПАСЛЯ-ЗАЎТРА

*«Ну што ты вырашыла з Новым годам?» — пацікавілася нядаўна каляжанка, з якой мы час ад часу перасякаемся на мерапрыемствах. Я толькі паціснула плячыма: пакуль ведаю толькі, што за межы краіны з сям'ёй не выедзем, а так яшчэ нічога. «Як гэта, ужо менш чым два месяцы засталося?!» — знаёмая глядзела на мяне з такім абурэннем, як быццам нам па шэсць гадоў, і я толькі што сказала, што Дзеда Мароза не існуе.*

*Я ў адказ зноў паціснула плячыма. Ведаю ад гэтай каляжанкі, што ў іх з мужам ёсць традыцыя — не, не хадзіць у лазню, а сустракаць кожны Новы год у новым месцы, і рытуал выбару і падрыхтоўкі да свята ў такім выпадку не менш важны, чым сама навагодняя ноч. Мілая сямейная традыцыя, якой можна захапляцца і нават зайздросціць, але хто сказаў, што ўсе астатнія павінны дзейнічаць па такім жа сцэнарыі? Усе мы розныя, адным даспадобы дакладны рэгламент і планаванне, а другім — гнуткасць і імправізацыя, адны ведаюць за паўгода, што будуць рабіць наступным летам, другія ж здольныя пачакаць да гадзіны ікс, а потым раптоўна выдаць геніяльны план і «за пяць хвілін даляцець». Не кажучы ўжо пра фінансавыя магчымасці, грамадскія і працоўныя абавязкі і знешнія абставіны, таксама індывідуальныя для кожнага.*

*Зрэшты, не збіраюся ўступаць у дыскусіі на тэму, у каго хлеб чэрствы, а ў каго жэмчуг дробны, каб не марнаваць свой і чужы час. Бо гаворка наогул не пра грошы і жаданне ці нежаданне як след напружыцца, каб потым як след адпачыць. Тут, мабыць, розніца ў прыярытэтах. Я дакладна ведаю, што не змагу растлумачыць знаёмай, як часам усе загадзя выбудаваныя схемы і графікі ляцяць у тартарары, калі тваё дзіця ў ноч з нядзелі на панядзелак раптоўна выдае тэмпературу пад сорак і іншыя сімптомы вірусанй інфекцыі, альбо, крый Божа, калі нечакана трапляе ў шпіталь хтосьці з бацькоў. А ў яе найважнейшы прынцып — бачу мэту, не бачу перашкод, таму можна падключыць усе рэсурсы, дэлегаваць паўнамоцтвы, выйсці з зоны камфорту і што там яшчэ раяць шматлікія матывацыйныя коўчы-трэнеры?.. Гэта не добра і не дрэнна, проста розны падыход.*

*Ёсць жыццёвыя сітуацыі, якія неабходна планаваць (скажам, медагляд, уласнае вяселле, заказ білетаў на цягнік ці самалёт), ёсць тыя, дзе варта рызыкнуць і нешта зрабіць спантанна альбо спалучыць тое і гэта — і толькі ад вас залежыць, дзе якую стратэгію прымяніць. Галоўнае — робячы, не шкадаваць, не збівацца з курсу і выразна бачыць межы паміж «планаваць» і «заганяць у рамкі», «адпусціць сітуацыю» і «бязвольна плыць па цячэнні». Так што, калі вы маеце час, імпэт і магчымасці, каб падарыць сабе ці яшчэ камусьці на Новы год штосьці такое, гэткае, насамрэч чароўнае, — рабіце і не слухайце нікога, хто сцвярджае, што цяпер так не робяць. Калі планы далёка не ідуць і абмяжоўваюцца сямейнай вячэрай ці сяброўскім застоллем у кампаніі тэлевізара і банальнага тазіка з аліўе — маеце поўнае права. А калі вы не ўпэўнены нават, што будзе заўтра, не тое што праз паўтара месяца, і ўсе думкі наконт Новага года ўкладваюцца ў формулу «няхай сабе наступае, там паглядзім», з вялікай верагоднасцю так і будзе. Андрэй Макарэвіч співае пра поезд, «Няшчасны выпадак» — пра графік, і кожны зноў застанецца пры сваім...*

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Тыя, хто побач

# Актыўнасць, шматдзетнасць і родная мова

## Сям'я Яўмененкаў раскрыла рэцэпт паспяховасці і з'яднанасці



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

**Нядаўна на прасторы Facebook я ўбачыла фота дзяўчыны, якая сабралася пайсці на Хэлоўін у выглядзе... шматдзетнай маці. Валасы дзяўчыны былі сабраныя ў неахайны пучок, пад вачамі намаляваны вялізныя чорныя кругі, адзета яна была ў брудную расцягнутую майку і спартыўныя штаны. У адной руцэ трымала ляльку, у другой — бутэлечку для кармлення немаўляці. Карціну завяршала яшчэ адна лялька, якая нібыта абдымала «маці» за нагу, а насамрэч была прывязана тонкім дротам... А сёння — насуперак такім вось уяўленням пра мнагадзетных — мы раскажам пра іншую маці і іншую сям'ю.**

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

Выйсце ёсць

# ДАВАЙ ДАМОВІМСЯ,

## або Як застацца людзьмі пасля разводу

**Нядаўна тата Ігната Шымановіча забраў сына з дзіцячага прытулку. Бацькі хлопчыка разышліся яшчэ ў 2013 годзе пасля 16 гадоў сумеснага жыцця. Ігнату на той момант было ўсяго пяць гадоў, сёння яму ўжо адзінаццаць. Некалькі месяцаў таму ён апынуўся ў прытулку, бо яго бацькі ніяк не могуць дамовіцца, з кім яму лепш жыць. За «вайной» сужэнцаў назірала ўся краіна. Там былі бясконцыя суды, абвінавачванні і выкраданні. На самай справе ўжо не важна, хто ў чым вінаваты.**
**Іх агульныя дзеці некалькі гадоў назіраюць, як два дарослыя, родныя ім чалавекі варагуюць паміж сабой. Ні суд, ні міліцыя, ні органы апекі не змаглі дапамагчы бацькам адумацца. Хоць на самай справе магчымасць дамовіцца заўсёды ёсць, калі гэтага хочуць абое. Ёсць і людзі, якія нават прафесійна дапамагаюць гэта зрабіць. Ужо са студзеня 2014 года працуе Закон Рэспублікі Беларусь «Аб медыяцыі». З'явілася магчымасць пазасудовага вырашэння грамадзянскіх спрэчак. Спецыялісты**




**«Медыятыўнага бюро» расказалі, з якімі праблемамі да іх часцей за ўсё звяртаюцца і як зберагчы цывілізаваныя адносіны з былым сужэнцам.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Сацыяльная кансультацыя

# РАБОТНІКАМ БЮДЖЭТНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ДА ВЕДАМА

**Мы ўжо пісалі, што з 1 студзеня 2020 года чакаецца змена ўмоў аплаты працы работнікаў бюджэтных арганізацый. Многіх цікавіць, што яшчэ можа памяняцца, акрамя памеру надбаўкі за працоўны стаж.**

**? — Ці застануцца выплаты матэрыяльнай дапамогі паводле калектыўнай дамовы на нараджэнне дзіцяці, да юбілейных дат, у сувязі са смерцю работніка або блізкіх сваякоў?**

Адказвае першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ:

— Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 18.01.2019 № 27 вызначана, што памеры, парадак і ўмовы аказання матэрыяльнай дапамогі вызначаюцца згодна з палажэннямі, якія зацвярджаюцца кіраўнікамі бюджэтных арганізацый.

Пры гэтым вызначана, што матэрыяльная дапамога, як правіла, аказваецца ў сувязі з неспадзяванымі матэрыяльнымі цяжкасцямі. Такім чынам, у палажэнні аб аказанні матэрыяльнай дапамогі, зацверджаным кіраўніком бюджэтнай арганізацыі, могуць быць прадугледжаны і іншыя падставы для аказання матэрыяльнай дапамогі.

**? — Ці будуць залічвацца ў стаж працы ў бюджэтных арганізацыях з 1 студзеня 2020 года перыяды рэгістрацыі грамадзян у якасці беспрацоўных у цэнтрах занятасці насельніцтва і ажыццяўлення грамадзянінам догляду інвалідаў I і II групы з выплатай дапамог тэрытарыяльнымі ўпраўленнямі сацыяльнай абароны?**



Адказвае намеснік начальніка ўпраўлення аплаты працы ў бюджэтнай сферы галоўнага ўпраўлення працы і заработнай платы Міністэрства працы і сацабароны Таццяна ЛУК'ЯНЧЫКАВА:

— Згодна з пунктам 4 Палажэння аб памерах і парадку ажыццяўлення стымулюючых (акрамя прэмій) і кампенсавальных выплат, прадугледжаных заканадаўчымі актамі і пастановамі Саўміна, зацверджанага пастановай Мінпрацы і сацабароны ад 03.04.2019 № 13, для вылічэння надбаўкі за стаж працы ў бюджэтных арганізацыях у стаж працы залічваюцца перыяды работы ў арганізацыях Рэспублікі Беларусь (бюджэтных і арганізацыях, якія атрымліваюць субсідыі, работнікі якіх прыраўнаваны па аплаце працы да работнікаў бюджэтных арганізацый).

Улічваючы выкладзенае, перыяды рэгістрацыі ў якасці беспрацоўных у рэгіянальных цэнтрах занятасці насельніцтва і ажыццяўлення догляду інвалідаў I і II групы ў стаж працы ў бюджэтных арганізацыях не залічваюцца.

**Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.**

Ведай сваё

# ПЯШКОМ ПА ВУЛІЦАХ СТАЛІЦЫ

## Фота з мемарыяльнымі дошкамі супраць экстрэмальных сэлфі

**Такія здымкі арганізоўваюць у сталічнай сярэдняй школе № 10 падчас пазнавальных экскурсій «Мая малая Радзіма — Мінск». Пад кіраўніцтвам сацыяльнага педагога школы Івана Шчарбакова вучні збіраюць цікавую інфармацыю пра вядомых людзей, у гонар якіх на будынках Партызанскага раёна размешчаны мемарыяльныя шыльды. Падчас міні-падарожжаў (у якія энтузіясты-школьнікі запрашаюць малодшых вучняў сваёй і іншых школ) усе ахвотныя не толькі робяць інфарматыўныя сэлфі, каб падзяліцца імі ў сацсетках, але і змяняюць сваё стаўленне да прагулак па горадзе, вучацца заўважаць, што адбываецца навокал.**



### Тут жылі людзі-легенды

Падобныя сэлфі-экскурсіі ў школе адбываюцца ўжо другі год. Па вясне і ўвосень дзеці выпраўляюцца па гарадскіх вуліцах раёна да дамоў, сцены якіх захоўваюць багатую гістарычную спадчыну. А малавядомыя факты пра гістарычных асоб робяць падарожжа яшчэ больш захапляльным.

Выправіўшыся на днях разам з вучнямі ў іх сэлфі-экскурсію, наш карэспандэнт даведалася, напрыклад, што месца для ўзвядзення сталічнага цырка падказала актрыса Ларыса Александроўская, якую спытаў пра гэта сам Сталін.

— Налета мы будзем адзначаць 75-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. А яшчэ 2019-ы і 2020-ы аб'яўлены Гадамі малой радзімы. З гэтай нагоды мы і вырашылі звярнуць увагу на гісторыю нашага Партызанскага раёна, — расказвае ідэйны натхняльнік сэлфі-экскурсій, **сацыяльны педагог школы № 10 Іван ШЧАРБАКОЎ.** — Мы заўважылі, што калі дзеці ідуць у школу, яны амаль не звяртаюць увагі на мемарыяльныя шыльды на дамах і часта не ведаюць, каму яны прысвечаны. З дапамогай упраўлення адукацыі нашага раёна і творчай групы вучняў шостых—восьмых класаў мы распрацавалі праект сэлфі-маршрута. Вывучалі гісторыю і выбіралі для падарожжа самыя цікавыя моманты з жыцця вядомых людзей.

А Партызанскі раён багаты на гістарычных асоб. Непадалёк ад самой школы, напрыклад, пражывала мноства палітычных дзеячаў, таму што гэта цэнтр горада, і менавіта тут знаходзіўся будынак Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі, кажа ў пачатку экскурсіі педагог.

Маршрут пачынаецца ад дома № 25 па вуліцы Захарава. На будынку шмат мемарыяльных дошак, і мы слухаем ад вучня 8 «Б» класа Юліяна аповед пра скульптара Аляксея Глебава, па праекце якога ў Полацку быў створаны помнік першадрукару Францыску Скарыне.

— Амаль усю інфармацыю шукае настаўнік, а мы потым адбіраем самае цікавае, што найбольш спадабалася і ўразіла. Рыхтуемся да кожнага маршруту не адзін дзень, — кажа Юліян, які не выключае, што з часам можа стаць прафесійным экскурсаводам.

З вуліцы Захарава збочваем у завулак Вайсковы і спыняемся каля дома-легенды № 12. Тут у свой час жылі і тварылі дзеячы мастацтва і пісьменнікі. Пра савецкага і беларускага драматурга Андрэя Макаёнка нам расказала вучаніца 6 «А» Аляксандра. І дадала, што ў праекце яна з самага пачатку:



— У сезон экскурсій удзельнічаю ў іх раз-два на тыдзень. Вельмі цікава даведвацца пра вядомых людзей і апавядаць пра іх іншым.

А яе аднакласніца Яна расказвала пра оперную артыстку і рэжысёра Ларысу Александроўскую, якая выпускала па дзве прэм'еры ў год.

— Мы вельмі любім нашы экскурсіі і часта ў іх удзельнічаем. Да нас нават далучаюцца дзеці з іншых школ з сваімі класнымі кіраўнікамі. Калі ты паглыбляешся ў гісторыю чалавека, то лепш пачынаеш разумець тое, што ён рабіў, — упэўнена Яна.

### Падарожнічаць у гісторыю, а не глядзець на выявы

Яшчэ адзін вядомы дом, каля якога заканчваецца наш сэлфі-маршрут, знаходзіцца на завулку Бранявым, 4. Як і дом на Вайсковым завулку, ён быў збудаваны ў канцы 60-х — пачатку 70-х гадоў мінулага стагоддзя, аднак абодва будынкі значна адрозніваюцца па архітэктуры ад «аднагодак».

— Дамы ствараліся для эліты таго часу. І цяпер тут жывуць або нашчадкі легендарных асоб, або заможныя людзі, якія могуць дазволіць сабе набыць такое жыллё. Архітэктурныя асаблівасці апартаментаў тут дагэтуль вызначаюцца пышнасцю і памерамі, і ні разу не даводзілася чуць, каб нехта з жыхароў паскардзіўся на камунальныя праблемы, — кажа Іван Шчарбакоў.

Пра Васіля Шарапава, які ў свой час быў міністрам шляхоў зносін і ўзначальваў Мінгарвыканкам, стаў мінчанінам года ў 2014 годзе і пражыў больш за 100 гадоў, ізноў расказваў Юліян. Летась школьнікі ўсім класам удзельнічалі ў адкрыцці мемарыяльнай шыльды ў яго гонар. «У 1980 годзе праходзілі Алімпійскія гульні ў Маскве. Каб дабрацца туды з еўрапейскіх краін праз Беларусь, спатрэбіліся добрыя дарогі, і яны былі створаны дзякуючы дзейнасці Васіля Шарапава», — дадае настаўнік.

Пра Ціхана Кісялёва, які больш за 20 гадоў старшынстваваў у Савеце Міністраў, расказала Ксенія. Вядомага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча Івана Палякова прадставіў Іван. З жыццём арганізатара партызанскага руху на Беларусі Сяргея Прытыцкага пазнаёміла Даша. І гэта толькі маленечкая частка інфармацыі, якая хаваецца за мемарыяльнымі дошкамі і памятнымі шыльдамі на дамах.



Кожны раз пасля такіх падарожжаў у школьнікаў з'яўляецца шмат цікавых фотаздымкаў, якімі яны з задавальненнем дзеляцца ў сацсетках.

— Мы любім змяшчаць свае здымкі ў акаўнтах, расказваць, дзе яны былі зроблены і чым адметныя людзі на іх. Гэта значна цікавей, чым рызыкаваць жыццём дзеля сэлфі ў небяспечных месцы, — кажуць вучні.

Уся экскурсія займае менш за гадзіну, каб дзеці не стаміліся і не страчвалі ўвагу. Аднак калі школьнікаў прыходзіць больш, маршруты могуць быць даўжэйшыя.

Многія з сённяшніх маладых экскурсантаў падумваюць з часам дапамагаць творчай групе Івана Шчарбакова, каб перадаваць цікавыя веды малодшым вучням. Творчыя школьнікі і іх крэатыўны і натхнёны настаўнік ужо плануюць налета стварыць новыя маршруты па знакавых мясцінах: зазірнуць у парк Горкага і сквер Янкі Купалы, наведаць Палац прафсаюзаў, Палац Рэспублікі, цырк. І ўсё гэта не проста каб паглядзець звонку і ўнутры, а каб здзейсніць сапраўднае падарожжа ў гісторыю.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# ДАВАЙ ДАМОВІМСЯ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— Медыятар — чалавек абавязкова з вышэйшай адукацыяй, які прайшоў дадатковую спецыяльную падрыхтоўку і атрымаў пасведчанне медыятара Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, — расказвае **медыятар, педагог Кацярына МІХАЙЛАВА.** — Асноўная задача медыятара — арганізацыя перамоў, падрыхтоўка да перамоў і іх правядзенне. Медыятар кіруе працэсам канфлікту і выводзіць яго ў прадукцыйнае рэчышча. Да нас часцей за ўсё людзі прыходзяць ужо ворагамі, у іх настолькі глыбокі разрыў, што яны не бачаць выйсця. Але нам вядомыя ўсе гэтыя працэсы, і медыятар становіцца часткай рашэння, а не часткай канфлікту.

**— З якімі спрэчкамі да вас звяртаюцца часцей за ўсё?**

— З камерцыйнымі спрэчкамі, а гэта невыкананне дагавора, спрэчкі паміж заснавальнікамі, карпаратыўныя спрэчкі, — расказвае **медыятар, юрыст Наталля ГАНЧАРОВА**. — Звяртаюцца і з грамадзянскімі спрэчкамі — гэта, напрыклад, розныя суседскія сваркі ці раздзел спадчыннікамі домаўладання. Але самыя частыя звароты — канфлікты пры падзеле маёмасці ў выпадку скасавання шлюбу, спрэчкі былых сужэнцаў аб удзеле кожнага ў выхаванні дзіцяці, пытанні выезду за мяжу дзяцей або з кім з бацькоў малым праводзіць канікулы. Усе гэтыя пытанні ў медыяцыі вырашаюцца проста, а пагадненні звычайна лёгка выконваюцца, таму што бакі дамаўляюцца добраахвотна. Людзям не патрэбна звяртацца па прымусовае выкананне дамоўленасцяў, нікому не даводзіцца аплачваць адміністрацыйныя штрафы за тое, што не здолеў своечасова перадаць дзіцяці. У нас такога няма, бо бакі сыходзяцца на тым графіку, які задавальняе ўсіх. На жаль, да нас прыходзяць ужо пасля таго, як прайшлі агонь, ваду і медныя трубы. Толькі потым дзівяцца: аказваецца, ёсць магчымасць дамовіцца неламаючы коп'яў.

**— Звычайна да медыятараў пары звяртаюцца пасля скасавання шлюбу ці падчас шлюбаразводнага працэсу?**

— Тут розныя выпадкі бываюць, — гаворыць **медыятар, псіхолаг Алена ЛЯСНАЯ.** — Бывае, людзі настроіліся на суд і пра медыяцыю не ведаюць. Калі да нас прыходзяць людзі да суда, то ім бывае цяжка дамовіцца, бо кожны перакананы, што перамога ў судзе за ім. У выніку часта адбываецца так, што абодва бакі пасля суда і становяцца ўжо амаль смяротнымі ворагамі, якім усё ж трэба выхоўваць агульных дзяцей. Ідуць да нас як да апошняй надзеі, хоць маглі б пазбегнуць судоў і нових крыўдаў.

— У судзе былыя муж і жонка змагаюцца адно з адным, —



дадае **медыятар, юрыст Аляксандр САРОКІН.** — У медыяцыі ж яны становяцца партнёрамі на шляху вырашэння агульнай праблемы. Яны прымаюць рашэнне самі, а медыятар проста дапамагае ім знайсці агульную мову. Калі канфлікт моцны, то мы згладжваем яго. Бываюць варыянты, калі людзі проста фізічна не могуць бачыць адно аднаго, тады працуем паасобку, распрацаваныя дамоўленасці пастунова параўноўваюцца, уносяцца карэктывы, і толькі пасля гэтага падпісваецца пагадненне.

— Калі казаць аб устанаўленні парадку зносін бацькоў з дзіцем, то часта былыя муж і жонка, прыходзячы да нас, вылучаюць толькі патрабаванні, — тлумачыць Алена Лясная. — Але калі пачынаеш задаваць пытанні: чаму, навошта, для чаго, то аказваецца, што ў абаіх ёсць агульны інтарэс — любоў да свайго дзіцяці і страх яго страціць... У працэсе разводу бацькі часта «рвуць» сваё ўласнае дзіця на часткі, і калі ўдаецца ім гэта паказаць, то яны звычайна мяняюць свой настрой і робяць неабходнае, каб дзіця развівалася і мела зносіны з кожным з іх. Канешне, ёсць і больш складаныя сітуацыі, калі за зацікаўленасцю мець зносіны з дзіцем хаваецца жаданне кантраляваць былога сужэнца. Часта гэта адбываецца падсвядома. Мы прагаворваем сітуацыю, і чалавек разумее, што, нягледзячы на развод, у яго яшчэ не скончыліся адносіны. Так здараецца з людзьмі нярэдка, бо пры падачы заявы на развод адзін бок звычайна ўжо ўсё для сябе вырашыў, а другі — не. Таму яны знаходзяцца на розных стадыях адпрацоўкі праблемы. І калі атрымліваецца іх прывесці да агульнага разумення, то дасягнуць дамоўленасцяў становіцца прасцей. Але бываюць і дзіўныя сітуацыі. Памятаю, як звярнуліся да нас маладыя сужэнцы падчас шлюбаразводнага працэсу, каб дамовіцца, хто, як і калі будзе даглядаць дзіця. Мужчына хацеў, каб іх агульны сын жыў з ім, бо ў яго былі створаны для гэтага ўсе ўмовы і зарабляў ён больш, чым жанчына. Але жанчына таксама хацела, каб дзіця жыло з ёй, бо малому было ўсяго тры з паловай гады і яна нічога дрэннага не зрабіла, каб ў яе адабралі дзіця. Мы тады вырашылі працаваць над тым, каб час выхавання малога быў падзелены хоць бы напалову. Пакуль працавалі, я ўсё ніяк не магла зразумець, чаму яны разводзяцца. Памятаю, як здзіўлена спытала: няўжо яны з-за дробязяў хочуць разысціся. Мы ўсё ж дапамаглі ім падзяліць час на выхаванне дзіцяці і разышліся. А праз некаторы час яны патэлефанавалі і папрасілі ў мяне кантакты добрага сямейнага псіхолага. Ведаю, што яны сышліся і жывуць разам.

**— Дапусцім, бацькі дагаварыліся. Але ж дзеці вырастаюць і могуць самі парушыць бацькоўскія дамоўленасці...**

— У такіх выпадках бацькам, канешне, лепш выступаць адным фронтам, — адказвае Кацярына Міхайлава. — Памятаю пару, якая засталася для мяне эталонам цывілізаванасці. Гэтыя людзі ўжо развяліся і жылі паасобку. Час з дзіцем і месца жыхарства былі размеркаваны. Але здарылася нечаканае для іх дванаццацігадовай дачкі: маці зноў пакахала мужчыну. Яны збіраліся пераехаць у новы горад. Дачка пабаялася прызнацца маме, што хоча застацца жыць з бацькам. Але калі дзяўчына паехала на выхадныя да таты, то проста не вярнулася назад да маці. Для жанчыны гэта быў шок. Яны з былым мужам, канешне, пасварыліся і нават заяву ў суд напісалі, але цвярозы розум перамог, і яны прыйшлі ў медыяцыю дамаўляцца. Жанчына адчувала сябе вельмі разгубленай, баялася страціць адносіны з дачкой. У бацькі ж былі ўсе козыры — дачка выбрала яго! Прынцып раўнапраўя медыяцыі быў парушаны. Але нам удалося падтрымаць жанчыну. У пагадненні вызначалася не тое, як маці будзе мець зносіны з дачкой, а тое, як будзе мець з ёй зносіны кожны з бацькоў. Разважалі так: сёння дзяўчынка хоча жыць з татам, а ў пераходным узросце пакрыўдзіцца на яго і паедзе да мамы. Мужчына разумеў, што так можа здарыцца, і таму пагадзіўся на больш справядлівыя ўмовы для ўсіх.

**— А ці здараюцца «правалы», калі медыяцыя не атрымліваецца?**

— Так, асабліва калі адзін з бакоў выкарыстоўвае медыяцыю як маніпуляцыю, як жаданне паўплываць на другі бок, — тлумачыць Алена Лясная. — Да нас звярнулася жанчына, якая была ў даволі працяглым канфлікце з былым мужам, яны ўжо нават не размаўлялі. Яна ж хацела раз'ехацца. Мужчына згадзіўся на медыяцыю, але, як потым стала зразумела, каб проста пагаварыць з ёй. Гэта была яскрава тая сітуацыя, калі ў яго не скончыліся адносіны... Яшчэ дамаўляцца не могуць маніпулятары. Яны прыходзяць у медыяцыю, каб адстаяць сваю пазіцыю, надламаць і прыціснуць другі бок. Мне здаецца, што многія «маніпулятары» проста не мелі досведу цывілізаваных дамоўленасцяў. Яны інакш і не ўмеюць. Ім трэба прайсці ўсе суды і інстанцыі, прайграць, і толькі тады яны будуць гатовыя чуць, адкрываецца медыятару і ісці дамаўляцца. Гэта ўжо асабісты рост для чалавека... Немагчыма дамаўляцца з алкаголікамі і наркаманамі, таму што гэтыя людзі не прытрымліваюцца таго, аб чым дамовіліся. Таксама мы не працуем з гвалтам, калі адзін бок можа націснуць на другі. Медыяцыя мае прынцып роўнасці, і калі мы бачым, што адзін з бакоў знаходзіцца ў сузалежных адносінах або ў адносінах, дзе адчувае сябе прыгнечаным, то медыяцыю таксама не праводзім.

**— Як усё ж расстацца былым сужэнцам так, каб зберагчы хоць б мінімальна цывілізаваныя адносіны?**

— Калі пара ўзаемна вырашыла скасаваць шлюб, то самае разумнае рашэнне — скласці перад падачай заявы на развод шлюбны кантракт. Усё ў ім прапісаць: з кім будуць жыць непаўналетнія пасля разводу, калі і як будуць сустракацца з бабулямі і дзядулямі з розных бакоў, які будзе памер аліментаў на ўтрыманне дзяцей і каму што адыходзіць з маёмасці. Пасля разводу кантракт уступіць у законную сілу.

Мы разумеем, што калі двое разводзяцца, то агульнай мовы паміж імі практычна няма. Таму дзяржава зараз падтрымлівае медыятыўную службу. Людзям у канфлікце неабходны кваліфікаваныя перагаворшчыкі, якія дапамогуць тую агульную мову знайсці.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**



*Злева направа:* **Алена ЛЯСНАЯ, Кацярына МІХАЙЛАВА, Аляксандр САРОКІН, Наталля ГАНЧАРОВА.**

## Дзіцячая пляцоўка

### КРАІНА «ВОСЕНЬ»

**Дзеці з райцэнтра Карэлічы правялі ў гэтым незвычайным мястэчку ўсе канікулы. У праекце «Рыжая восень», які зладзілі ў аздараўленчым лагеры «Малышок», паўдзельнічалі вучні карэліцкай школы № 1.**

За тыдзень былі тут і Дні казачных пераўтварэнняў, калі дзятва з супрацоўнікамі Карэліцкай дзіцячай бібліятэкі разважала, як змяняецца прырода. І Дзень асенняга настрою, прысвечаны сяброўству, адзінству і згуртаванасці. І Дні ўраджаю, грыбоў і птушак, што для малых сталі сапраўднай скарбонкай ведаў, конкурсаў ды спаборніцтваў.

Дадайце сюды паходы ў кіно, гульні, танцы, спевы і казкі на новы лад... А яшчэ экскурсію на льнозавод, дзе малым не толькі паказалі сапраўдную вытворчасць, а і зладзілі майстар-клас па вырабе лялек-абярэгаў з ільну.

### «АНТЫРЭКЛАМА» СТАЛА НАЙЛЕПШАЙ

**Пад такой назвай выступала каманда пераможцаў раённага этапу абласнога фестывалю КВЗ сярод школьных камандаў, што на днях прайшоў у Астраўцы.**



Акрамя каманды «Антырэклама» з гімназіі № 1, за званне найлепшых прыкалістаў змагалыся «4 рэгіён» сярэдняй школы № 1 і «Міні Лэдзі» Варнянскага НПК (гэта каманда была цалкам дзявочая). Сярэдняя школа № 3, дзе прайшоў фестываль, пачула і пабачыла нямала жартаў. Тут была і мініяцюра пра важнасць флікера і небяспеку трапіць да астравецкіх міліцыянераў. І замалёўка пра бацьку, які правяраў уласны дзённік. І сцэна, у якой вучылішча ператварылася ў школу чараўнікоў Хогвартс...

Арганізатары мерапрыемства нагадалі, што ў Клубе вясёлых і знаходлівых гуляюць не дзеля перамогі, а дзеля ўласнага задавальнення.

### ВУЧЫМСЯ ДАБРЫНІ

**Паўдзельнічаць у міні-казках, каб зразумець, што такое дабрыня, запрасілі на днях дзетак з педагагічнага комплексу яслі-сад — сярэдняя школа аграгарадка Баруны, што на Ашмяншчыне. У сельскім клубе для малых арганізавалі музычна-забаўляльны калейдаскоп «Добрым быць зусім-зусім не проста!»**

Малыя абаранялі мышаня ад яго бабулі, якая злавалася на ўнука за разбіты кубак і ганялася за ім з венікам. І вучні, і дзетсадаўцы дружна сталі «сценкай» і тлумачылі, што мышаня зрабіла гэта ненаўмысна, — і перакаалі бабулю! На радасцях яна прапанавала ўсім разам згуляць у «Хусцінкі» і «Кошкі-мышкі». Дзеці дапамаглі і тыгранцы, якое трапіла ў пастку, за што ўдзячны «паласацік» разам з пеўнікам таксама запрасілі малых пагуляць.

А вось вызначыць словамі, што такое дабрыня, аказалася не так проста. Агульнымі намаганнямі дзятва высветліла, што гэта жаданне рабіць іншым прыемна, прынесці ім радасць, быць цярпімымі і спагадлівымі, спачуваць людзям. Перадаючы адзін аднаму цацачнае мяккае сэрцайка, дзеткі казалі і добрыя словы.

І справіліся з гэтай задачай, сэрцайка не паранілася і не разбілася, аднак усе зразумелі, што добрым быць зусім-зусім не проста, але ж дабрыні можна і трэба вучыцца, каб свет стаў лепшы.

**Падрыхтавала Ірына СІДАРОК.**

## Нататкі шматдзетнага таткі



Вера:

— Тата, а ты ведаеш, што выйшаў новы мульцік пра Прастаквашына і там з'явілася маленькая дзяўчынка, якую завуць Вера Паўлаўна?

— Так? А прозвішча ў яе выпадкова не Холад?

— Не ведаю.

Дзеля інтарэсу вырашыў высветліць «радаслоўную» мульцяшнай Веры Паўлаўны:

— Гэта атрымліваецца, што яна дачка Дзядзькі Фёдара, ці што?

— Не, сястра.

Поля няўпэўнена:

— А па-мойму, дачка...

Вера:

— Поля, гэта дакладна яго сястра.

(Калі двайняткі пачынаюць спрачацца, выйсце заўсёды адно: спытацца аб прадмеце спрэчкі ў «Гугла».)

У выніку адпаведнага запыту мы высветлілі, што Вера Паўлаўна і праўда малодшая сястра Дзядзькі Фёдара. Таму, выходзіць, мая Вера Паўлаўна мела рацыю.

Пры гэтым падчас «даследавання» высветліўся іншы цікавы нюанс: згодна з мультфільмам, тату Веры Паўлаўны (і, адпаведна, Дзядзькі Фёдара) чамусьці завуць... Дзмітрый (?!). На гэту невялікую няўвязачку стваральнікі мультфільма ўвагі, відаць, не звярнулі.

Цяпер, каб выправіць прыкрую памылку, яны абавязкова павінны ўвесці ў наступнай серыі новы персанаж: нейкага Паўла, роднага бацьку Веры Паўлаўны. А можа, чым чорт не жартуе, і Дзядзькі Фёдара (нездарма ж ад нас столькі гадоў хаваюць яго імя па бацьку).

А пакуль, згадзіцеся, сямейка атрымліваецца, мякка кажучы, дзіўная: хлопчык па імені Дзядзька Фёдар, малая Вера Паўлаўна і іх тата Дзмітрый (так і хочацца сказаць «Ілжэдзмітрый»).

***P. S.** У гэтай неаднастайнай кампаніі толькі Шарык з Матроскіным выглядаюць больш-менш нармальнымі людзьмі.*

☺ ☺ ☺

Двайняткі за кухонным сталом лепяць з пластыліну нейкія фігуркі. Раптам Вера бярэ сальніцу і пасыпае пластылін соллю.

Я, здзіўлена:

— Ты навошта пластылін солішь?

— Каб Ксеня яго не ела.

— А яна яго есць?

— Так.

— Усё роўна не салі, раптам ён з соллю яшчэ смачнейшы будзе?

— А што тады рабіць?

— Проста не давайце ёй пластылін.

Сказаў, а самога так і падмывае пакаштаваць: спачатку з соллю, потым без (ці наадварот). За апошнія сорак гадоў я, сорамна сказаць, зусім забыўся на смак пластыліну.

***P. S.** Хоць па старой памяці здаецца, што наяўнасць або адсутнасць солі ў гэтым выпадку непрынцыповая.*

**Павел ХОЛАД.**

# МАЯ МАМА — БІБЛІЯТЭКАР!

**Госці сённяшняй рубрыкі — супрацоўніца Нясвіжскай цэнтральнай раённай бібліятэкі Валянціна Шчарбакова і яе дачка. Дакладней, адна дачка з пяцярых дзяцей у вялікай сям'і. Самая старэйшая Каця ўжо сама тройчы мама, сын Аляксей вучыцца ў Ляхавіцкім каледжы на ветэрынара («пра тое, што робіць са свінкамі ветэрынар, ён распавядае так натхнёна, як я пра паэтаў», — жартуе маці), сярэдняя дачка Алена — у Баранавіцкім каледжы атрымлівае прафесію повара і кандытара, а пры бацьках засталіся толькі дзве малодшыя: шасцікласніца Лера і дзетсадавец Віталік. Прадоўжыць справу бібліятэкара марыць (прынамсі, на сённяшні момант) якраз Віталік: ён складвае на вазок кніжкі з дамашняй бібліятэкі, перавозіць іх з пакоя ў пакой і «выдае» сямейнікам, пазначаючы нешта ў спецыяльным фармуляры. «Гэта проста ён разам са мной нейкі фільм глядзеў, дзе так кніжкі развозілі, вось і спадабалася, а раней ён марыў стаць святаром!» — смяецца сястра. А Валянціна Васілеўна толькі разводзіць рукамі: такія яны, дзеці, рознахарактарныя і пераменлівыя...**



— Да прафесіі бібліятэкара мяне, мабыць, лёс скіраваў, — расказвае і нам, і Леры Валянціна Шчарбакова. — Яшчэ ў дзяцінстве любіла прысвойваць кніжкам нумары і як быццам выдаваць іх, потым праходзіла школьную практыку ў бібліятэцы. Помню, як цікава было перапісваць карткі, як утульна і добра было ў нашай вясковай бібліятэцы ў Рудаўцы. Але бацькі пераканалі, што трэба працягнуць дынастыю настаўнікаў, да таго ж перамог «шкурны інтарэс»: настаўнік атрымліваў 120 рублёў заробку, а бібліятэкар — усяго 80. Так што першай маёй спецыяльнасцю была «Настаўнік пачатковых класаў, кіраўнік дзіцячай творчасці» ў нашым Нясвіжскім педвучылішчы, потым, на філфаку педагагічнага інстытута імя М.Танка, — «Настаўнік беларускай мовы і літаратуры». Але да дэкрэту настаўнікам працавала зусім нядоўга, а пасля ў школе не было месца, затое патрабаваліся людзі ў бібліятэку, туды і пайшла. Потым, ужо на базе вышэйшай адукацыі, атрымала ў Інстытуце культуры спецыяльнасць бібліятэкара і бібліёграфа.



***— Былыя студэнты Інстытута культуры расказвалі, што ў экзаменацыйных білетах у іх значылася пытанне «Роля дзіркі ў каталожнай картачцы». Жартавалі?..***

— Не ведаю, у мяне такога пытання не было, — смяецца Валянціна Васілеўна. — У параўнанні з філалагічным факультэтам, на мой погляд, нам давалі больш практыка-арыентаванай інфармацыі, і загрузка была такая, што пасля першай сесіі я некалькі дзён адлежвалася. На той момант мне было 37 гадоў, і я лічыла сябе «старой» для студэнткі, але пажылыя выкладчыкі Інстытута культуры ўласным прыкладам паказвалі, што бадзёрасць духу, энергічнасць і актыўная жыццёвая пазіцыя не залежаць ад узросту. Мабыць, я набралася ад іх гэтай энергіі і прыехала ў Нясвіж абсалютна з іншым настроем, з жаданнем рэалізаваць мноства ідэй... Большую частку жыцця я адпрацавала ў бібліятэцы. Але ўзнікла сітуацыя, калі на працягу чатырох гадоў муж не мог знайсці работу, і я пайшла дадаткова працаваць у школу. Спачатку гэта было фінансавае ўліванне ў сямейны бюджэт, а цяпер я ўжо школу не магу пакінуць — вяду там гурток «Юны журналіст», мы сустракаемся з людзьмі розных прафесій, потым дзеці рыхтуюць артыкулы для раённай газеты, а я пішу сцэнарыі для рубрыкі на раённым радыё (у духоўна-асветніцкай перадачы «Абуджэнне», якую вядзе Аксана Грох). Разам з імі мы зрабілі таксама электронны часопіс «Парады з вуснаў нясвіжан», прысвечаны журналістыцы і паэтцы, якая першай падтрымала наш праект, — Соф'і Любанец. Дзяцей у гуртку вучу, напэўна, не столькі журналістыцы — азы майстэрства спасцігаю разам з імі праз інтэрнэт-урокі, — колькі таму, што перш чым стаць кімсьці, журналістам ці бібліятэкарам, трэба стаць чалавекам.

Лера Шчарбакова скончыла студыю выяўленчага мастацтва, абышла ўсе творчыя гурткі, цудоўна шые, і пры гэтым паспявае вучыцца ў профільным — спартыўным — класе і займацца баскетболам.

— Я з дзяцінства ў бібліятэцы: спачатку чытала тое, што мама прыносіла, потым у чытальнай зале сама пачала выбіраць. Помню, больш за ўсё падабаліся энцыклапедыі — пра дыназаўраў, пра Залаты век. Часопісы па рукадзеллі, мабыць, усе, якія былі ў бібліятэцы, перагледзела і ўсё, што ў іх было, перарабіла. Зрэшты, у нас і дома вялікі стэлаж з кнігамі, так што ў мяне ніколі не было праблем, што б пачытаць, — расказвае Лера.

***— Што самае складанае ў прафесіі бібліятэкара?***

**Л.:** — Пісаць сцэнарыі для мерапрыемстваў! А калі прыйшоў у бібліятэку чалавек не ў гуморы, які пачынае з парога прыдзірацца і скандаліць?.. Тады мама не напіша сцэнарый.

**В.:** — З непрыемнымі наведвальнікамі я не сутыкалася, нашы чытачы — людзі інтэлігентныя, з імі заўжды цікава і прыемна мець справу. Бывае, калі няма іншых людзей, то гадзіну можа доўжыцца размова, бо бібліятэкар у невялікім горадзе — ён і культработнік, і крыніца інфармацыі, і псіхолаг. Што да сцэнарыяў... Паколькі мне гэта работа падабаецца, не магу назваць яе складанай. Няпроста бывае, толькі калі няма натхнення і няма часу яго чакаць, але і тады з малітвай Гасподзь дае знайсці патрэбныя словы.

***— Тады што самае прыемнае?***

**Л.:** — Ну, не ведаю. Для мамы, пэўна, весці «Сямейны клуб». А для бібліятэкара наогул — выдаваць кнігі.

**В.:** — Дакладна так, Лера мае рацыю: самае прыемнае — сядзець на абанеменце і сустракаць чытачоў. Яшчэ ў мяне ёсць клубы: «Сямейны», «Ноеў каўчэг», літаратурна-музычнае аб'яднанне «Валошкі», раней яшчэ была суполка для сталых людзей «Ясь і Яніна», і кожны клуб — гэта людзі, новыя сустрэчы, знаёмствы. Таксама прыемна, калі чалавек просіць нешта параіць пачытаць, давярае табе. У мяне быў выпадак: адна чытачка з пэўнай паблажлівасцю ставілася да беларускай мовы, дык я знайшла ёй цыкл Генрыха Далідовіча пра настаўнікаў і аповесць Івана Шамякіна «Ах, Міхаліна, Міхаліна», і ёй так спадабалася, што прыйшла, папрасіла: «Дайце яшчэ!»

***— Наўрад ці нехта назаве прафесію бібліятэкара прыбытковай. Калі дачка вырашыць стаць бібліятэкарам, то...***

**Л.:** — Не, не стану. Я хацела спярша быць мадэльерам, але рабіць адзенне не для людзей, а для сабак — але быў час, вельмі многа шыла, нават па начах, і перагарэла. Цяпер хачу быць ветэрынарам, я добра ладжу з жывёламі... Хоць бібліятэкар, мне здаецца, паважаная ў грамадстве прафесія, нават лепш за блогера. Бо бібліятэкара можна сустрэць паўсюль, а блогера — толькі на YouTube.

**В.:** — Безумоўна, бібліятэкар — гэта не пра грошы, але маральнае задавальненне, адчуванне карысці для людзей, якое я атрымліваю ад сваёй працы, пераважае матэрыяльныя меркаванні. Мне хацелася б, каб хтосьці з маіх дзяцей працягнуў мае ідэі, таму адгаворваць не буду, але не буду і прымушаць. Трэба, каб выбар ішоў ад душы, ад сэрца.

***— Калі расказаць пра бібліятэкара двума-трыма словамі, то якія гэта будуць словы?***

**Л.:** — Бібліятэкар — зачытаны, у сэнсе, перачытаны... Ой, начытаны! Натхнёны. І цярплівы. І разумны — у бібліятэцы нельга шумець, таму можна засяродзіцца на сваіх думках.

**В.:** — Наша прафесія — гэта спасціжэнне, пастаяннае адкрыццё новага... А трэцяе, напэўна, радасць. Радасць ад таго, што ты робіш, ад цікавых сустрэч, карысных як для чытача, так і для цябе самога.

**Гутарыла Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

# Актыўнасць, шматдзетнасць і родная мова

**Гэта новы від шматдзетных беларусаў — сучасныя, адукаваныя, актыўныя і, канешне, шчаслівыя. У сям'і Яўмененкаў ёсць разыначка: яны беларускамоўныя і свядома прывіваюць сваім малым любоў да роднай краіны, мовы і культуры. Гэта сям'я бярэ ўдзел у краўдфандынгу, падтрымліваючы выданне кніг на роднай мове, любіць вандраваць па краіне, вывучаючы гісторыю, наведвае фестывалі і сама арганізуе касцюмаваныя вечарыны. У Віктара і Іны пакуль трое дзетак: шасцігадовы Брачыслаў, амаль трохгадовая Радаслава і маленькі васьмімесячны Альгерд. Прадпрымальнік Віктар і харэограф Іна згадзіліся падзяліцца сакрэтамі нараджэння ўласнай сям'і і яе жыццёвымі інтарэсамі.**



**Віктар:** — Мы даведаліся адно пра аднаго праз сайт знаёмстваў. Так, не здзіўляйцеся. На гэтых сайтах, безумоўна, ёсць і бессаромнасць, і пошук партнёра для сексу, але ёсць сапраўдныя адносіны і сустрэчы. Падобныя сайты сталі ўжо часткай сучаснага жыцця.

**Іна:** — Ён першы зайшоў на маю старонку і напісаў мне. Гэта была звычайная перапіска паміж людзьмі, падобная на «прывітанне, як справы, што робіш», якая магла нічым не скончыцца, але вось як дзіўна ўсё атрымалася. Перапісваліся каля двух тыдняў, а потым абмяняліся нумарамі тэлефонаў.



**Віктар:** — Часта на этапе перапіскі ўсё і затухае, а ў нас — не. Прыехаў да яе на машыне ўвечары, і таму першы раз яна мяне ўбачыла толькі ў цемры.

**Іна:** — Ён такі кавалер, канешне *(смяецца)*! Прыехаў да мяне і нават не вылез з машыны! Я тады падумала, што ён маленькага росту, камплексуе, таму і не вылазіць. Злавалася, бо мы павінны былі сустрэцца ў чацвер, а ён прыехаў у аўторак. Я ўжо нават макіяж зняла і збіралася рыхтавацца да іспытаў у аўташколу. А ён патэлефанаваў, і так настырна: маўляў, прыеду, і ўсё тут. Дзіўлюся сама сабе — выйшла да яго. А там слова за словам, і не заўважылі, як прайшло некалькі гадзін.

**— Вы адразу пачалі размаўляць на беларускай?**

**Іна:** — Не. Я была рускамоўная, і са мной Віктар гаварыў па-руску. Але яшчэ на пачатку перапіскі я зайшла на яго старонку сайта «Аднакласнікі» і ўбачыла, што яна на мове. Для мяне гэта было трошкі дзіўнавата, таму што ў маім асяроддзі такога не было. Але я не адчувала чагосьці іншароднага для сябе і таму ішла далей на кантакт. Тым больш я сама са шматдзетнай сям'і, дзе з павагай адносіліся да інтарэсаў адно аднаго.

**Віктар:** — Для мяне ж было важна, каб Іна да мовы не ставілася з пагардай, каб яе не раздражняла гучанне беларускай. Для сябе адразу адзначыў, што яна з добрай сям'і, і вырашыў не цягнуць. Праз паўгода мы з'ехаліся, а праз год ужо гулялі вяселле.

**— Хуткія вы... Не баяліся, што памыліцеся?**

**Віктар:** — Я адчуваў сябе ўпэўнена. Ды і чаго чакаць? Мне быў 31 год, жонцы — 25. З Інай я па-сам'ю. Мне хацелася дзяцей, прычым я свядома хацеў стаць шматдзетным. Тым больш я меркаваў стаць бацькам у хуткім часе, бо разумею, што жыццё не бясконцае і дзяцей трэба мець маладым. Вось мне за трыццаць, калі адразу народзіцца дзіця, то яно будзе вучыцца ва ўніверсітэце, калі мне стукне 50! Хутчэй за ўсё мае дзеці таксама не захочуць рана нараджаць. І калі я збіраюся патанчыць на вяселлі сваіх дзяцей, і каб яшчэ з мяне не сыпалася труха, то трэба адназначна да сарака іх нарадзіць. Калі нам пашанцуе, то мы з Інай будзем здольныя і з унукамі пагуляць.

**Іна:** — А вось я пра гэта ўвогуле не думала. Проста закахалася і ўсё. Марыла толькі, што калі і будзе сям'я, то каб такая ж дружная, як і ў мяне. Я захапляюся сваімі роднымі.

**Віктар:** — Не тое, што я кожную хвіліну думаў: маўляў, гадзіннік цікае. Проста ў мяне было разуменне гэтага. Але ж ёсць розныя людзі і такі варыянт не для ўсіх. Мой малодшы брат нават і не думае пра дзяцей і адчувае сябе вельмі камфортна. У мяне асабіста была патрэба ў сям'і. Прычым мне заўсёды хацелася вялікую сям'ю, каб нават не трое, а пяцёра дзяцей было!

**— А будучая жонка пра гэта ведала?**

**Іна:** — Канешне. Што мне падабаецца ў маім мужу, дык гэта тое, што мы пра ўсё дамаўляліся яшчэ «на беразе». То бок усё, што цяпер адбываецца ў нашай сям'і, — не сюрпрыз. Небяспечна выходзіць замуж, не дамовіўшыся аб сур'ёзных рэчах.

**Віктар:** — Людзі, якія думаюць, што дамовяцца ў працэсе, дадамаўляліся так, што сёння ў краіне палова заключаных шлюбаў распадаецца. Мне хочацца, каб у нашай сям'і адносіны будаваліся гарызантальна, а не іерархічна. У тым сэнсе, што мае дзеці ад нараджэння паўнавартасныя людзі. Мне хочацца быць не толькі бацькам, але і сябрам для іх. Я разумею, што не змагу прывязаць дзяцей да сябе, але спадзяюся, што мы будзем ставіцца з павагай адно да аднаго, нават калі ў нас будуць розныя светапогляды. Сваяцкія сувязі для мяне — гэта не пра грошы. Пакуль я іх забяспечваю як бацька. Потым, калі, скажам, дзіця паступіць на бюджэт, я забяспечу яму побыт на час навучання. Не больш. Ніякіх кватэр і машын купляць не буду. Пасля пачатку працоўнага жыцця грошы буду толькі пазычаць.

**Іна:** — Гэта цяпер ён так думае, а як на самай справе будзе, невядома *(усміхаецца)*.

**Віктар:** — Згодны, розныя сітуацыі здараюцца. Але я павінен дзецям прагаварыць сваю пазіцыю зараз. Каб яны раслі і настройваліся сябе на самастойнасць, а не на ўтрыманства.

**— Вы так добра размаўляеце на роднай мове. Як сям'я стала беларускамоўнай?**

**Віктар:** — Мову я сам вывучыў ужо дарослым. З практычнага пункту гледжання, магчыма, і неабавязкова вучыць беларускую мову, бо, калі ты жывеш у Беларусі, можна абысціся і рускай. Але калі раптам захочацца паехаць да іншых суседзяў: ва Украіну, Польшчу, Балгарыю ці нават Сербію, дык калі ведаеш беларускую мову і можаш на ёй добра размаўляць, цябе там зразумеюць. Выпрабавана на сабе. Беларуская мова — ключ да ўсіх славянскіх моў. Да таго ж калі людзі ведаюць дзве мовы, то ў іх узнікае нашмат больш нейронных сувязяў — гэта даказана навукова, — а калі чалавек ведае тры мовы, ён ужо амаль не можа захварэць на хваробу Альцгеймера.



**Іна:** — Пакуль мы сустракаліся, пытанне мовы ўвогуле не ставілася. А вось калі нарадзіўся сын Брачыслаў, то муж стаў мяне ўпэўніваць: маўляў, для развіцця вельмі карысна. І я павялася *(смяецца)*. Ідэя мне падабалася, я нават злавіла нейкі кайф ад двухмоўя. Калі пачала чытаць на мове і размаўляць, то мозг стаў шурупіць лепш, аднаназначна.

**— Вашы дзеці таксама гавораць па-беларуску?**

**Віктар:** — Не заўсёды. Мы не прымушаем. Самі, калі захочуць, будуць размаўляць. Нашы дзеці ходзяць у рускамоўны садок. Але дома, напрыклад, мы размаўляем на беларускай мове. Канешне, калі захацець, то можна намагацца, каб дзіця заўсёды размаўляла на мове. Але для нашай сям'і гэта цяжка тэхнічна: знайсці беларускамоўны садок у раёне аказалася немагчыма, таму мы афармілі дзяцей у рускамоўны садок паблізу. Брачыславу, напрыклад, вельмі падабаецца такое становішча. Ён пачаў пытацца аб перакладзе некаторых слоў, якія раней не чуў. Калі да нас у госці прыходзяць яго сябры, то яны не заўсёды разумеюць, калі мы звяртаемся да іх пабеларуску, губляюцца. А наш сын тады перакладае для іх.

**— Чаму ўсё ж вырашылі стаць шматдзетнымі? Сёння да такіх сем'яў неадназначнае стаўленне...**

**Віктар:** — Беларусаў павінна быць больш *(смяецца)*. На самай справе шматдзетнасць — гэта выклік. Дзеці для мяне — стымул зарабляць грошы. Мая сям'я — частка маіх амбіцый. Для кагосьці гэта можа стаць прычынай падрыву здароўя, а вось мне пашанцавала — мая жонка квітнее!

**Іна:** — А мой муж раней быў сапраўдны «сухар», а цяпер стаў больш мяккім, клапатлівым, уважлівым. Некаторыя мае сяброўкі раяць яму знайсці ўжо іншы стымул для заробку, акрамя дзяцей. Я смяюся. Мне добра і так.

**Віктар:** — Але шматдзетнасць усё ж не для ўсіх. Нам падабаецца шум, гам і дзіцячы смех. Для іншых тое самае — гэта стома і дурдом. Вось раней я спаць клаўся і ў гадзіну ночы, цяпер — у дзевяць, і сплю, як немаўля. Бывае, сумую па тым часе, калі не быў падпарадкаваны рэжыму, планам і дысцыпліне, сумую па спантаннасці. Але ў нашым жыцці з'явілася нашмат больш: моцная сям'я, любоў, гонар, вандроўкі, дзіцячыя вечарыны. Гэта вельмі сур'ёзна! На кожны дзень нараджэння дзіцяці ствараецца спецыяльная вайбер-група, шыюцца касцюмы, арганізуюцца фотазоны, забаўляльныя мерапрыемствы. Увесь гэты працэс вельмі падабаецца маёй жонцы. Я толькі дзіўлюся яе энергіі. Яна ж у мяне яшчэ і на фітнес паспявае хадзіць, а была б яе воля, яна б мяне на ровары прымусіла ўсю Беларусь аб'ехаць. Але спорт я не люблю, хоць за вагой сачу, таму спыніліся на аўтамабільных вандроўках.

**Іна:** — А мне лёгка ўсё гэта рабіць для тых, каго люблю і кахаю.



**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## «Строительство группы жилых домов (3-й пусковой комплекс) и проектируемой улицы № 9 (продолжение ул. Лопатина) на территории микрорайона № 1 жилого района «Копище» в д. Копище Минского района. Жилой дом № 35 по генплану с подземной гараж-стоянкой»

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг» информирует о привлечении денежных средств граждан, включая индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, для долевого строительства жилых помещений в жилом доме № 35 по генплану в Минском районе без использования государственной поддержки и (или) ограничения прибыли застройщика.

**Информация о застройщике:**

Общество с ограниченной ответственностью «СИ-трейдинг», зарегистрировано решением Минского областного исполнительного комитета от 30 апреля 2003 г. № 318 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690237128.

**Место нахождения:** Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Копище, ул. Лопатина, д. 5, офис. пом. № 1, телефон/факс +375 (17) 392-20-45(46), +375 (29) 333-55-66.

**Режим работы:** понедельник–пятница, с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье, обед: 13.00–14.00;

